ных могільнікаў і вясковых паселішчаў (Г.В.Штыхаў, Л.У.Дучыц, Т.М.Каробушкіна, У.У.Багамольнікаў, А.М.Плавінскі, Я.Р.Рыер, Ю.А. Заяц, В.У.Шаблюк, А.В.Іоў, М.В. Клімаў і інш.), каменных магіл (А.В. Квяткоўская). Атрыманыя вынікі дазваляюць вызначыць матэрыяльную культуру феадальнай вёскі, асвятліць этнічную гісторыю насельніцтва Беларусі.

З 2006 існуюць 3 аддзелы А.: першабытнага грамадства, А. сярэдневяковага перыяду, захавання і выкарыстання археал. спадчыны, якія знаходзяцца ў складзе Цэнтра гісторыі даіндустрыяльнага грамадства Ін-та гісторыі НАН Беларусі. Унутраная структура аддзелаў змяшчае таксама сектары бронзавага і жалезнага вякоў, навук. археал. фондаў, навук. рукапісны архіў (больш за 4,5 тыс. адзінак захоўвання) і б-ку (звыш 6 тыс. адзінак). У памяшканнях часовага і фондавага захавання змешчаны сотні тысяч артэфактаў розных эпох з больш чым 1,5 тыс. археал. помнікаў. Усяго па Беларусі сабраны і ўведзены ў базу дадзеных звесткі аб 3 тыс. археал. аб'ектаў.

Пры археал. аддзелах у Ін-це гісторыі з 1993 працуе Палявы к-т, які згодна з інструкцыяй (зацверджана ў маі 2006 Прэзідыумам НАН Беларусі) аб палявых даследаваннях ажыццяўляе выдачу Дазволаў на правядзенне археал. раскопак, каардынацыю даследаванняў на тэр. Беларусі, экспертызу навук. палявых справаздач, забяспечвае выкананне норм дзеючага заканадаўства ў галіне археал. навукі.

Стараж. помнікі Беларусі вывучаюць таксама выкладчыкі БДУ, Гомельскага, Гродзенскага, Магілёўскага, Віцебскага, Брэсцкага ун-таў, Бел. пед. ун-та імя М.Танка, супрацоўнікі Нац. гіст. і рада абл. і раённых краязнаўчых музеяў. Дасягненні бел. археолагаў у вывучэнні мінулага Беларусі абагульнены ў 3 тамах «Прац» (1927—32) даваен. часу, калект. работах «Нарысы па археалогіі Беларусі» (ч. 1—2, 1970—72), «Беларуская археалогія» (1987), 4-томнай працы «Археалогія Беларусі» (1997—2001). На матэрыялах звыш стагодніх распрацовак у галіне бел. А. прадстаўлена цэласная карціна развіцця першабытнага і сярэдневяковага грамадства.

Сотні тысяч каменных, гліняных, металічных, касцяных, драўляных і шкляных вырабаў, зброі, твораў мастацтва, у т.л. унікальных знаходак, сталі асновай экспазіцый рада музеяў краіны. У 2007 у Ін-це гісторыі адкрыта археал. навук.-музейная экспазіцыя, якая з'яўляецца навук.-інфармацыйна-адукац. цэнтрам у Рэспубліцы Беларусь.

*М.М.Крывальцэвіч, В.М.Ляўко, Г.В.Штыхаў.*

**АРХЕАЛО́ГІЯ АРХІТЭКТУ́РЫ**, галіна *археалогіі*, якая вывучае рэшткі загінуўшых або значна перапрацаваных помнікаў архітэктуры і на аснове атрыманых звестак аднаўляе планы і па магчымасці рэканструюе фасады і асн. аб'ёмы помнікаў у цэлым. Навук. археал. даследаванні архіт. помнікаў пачаліся ў 1820—40-я гг. ў Зах. Еўропе, у 19 — пач. 20 ст. — у Расіі. У 1930—40-я гг. А.а. вылучылася ў самаст. галіну археалогіі, распрацавана методыка археал. вывучэння архіт. помнікаў. У Беларусі першыя археал. даследаванні архіт. помніка праведзены ў канцы 18 ст., калі ў Полацку невядомы даследчык раскапаў падмуркі *Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра*. З канца 19 ст. вывучаецца найб. стараж. помнік мураванай архітэктуры Беларусі — *Полацкі Сафійскі сабор*. Рэканструяваны помнікі архітэктуры 12 ст. — Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку і *Гродзенская Барысаглебская царква*. Археал. даследаванні выявілі 10 мураваных будынкаў у Полацку, рэшткі каменных храмаў 11—12 ст. у Мінску, 12—13 ст. у Мсціславе, 12 ст. ў Тураве, палацавай і культавых пабудоў у Гродне (гл. *Гродзенскі княжацкі церам*, *Гродзенская Ніжняя царква*). У выніку археал. раскопак выяўлены рэшткі вежаў-данжонаў, аналагічных *Камянецкай вежы*, у Брэсце, Тураве, замкавых вежаў у Навагрудку. Даследаваны многія помнікі абарончага дойлідства 14—18 ст. (*Лідскі замак*, *Гродзенскі Стары замак*, *Гродзенскі Новы замак*, *Геранёнскі замак*, замак у г.п. Мір Карэліцкага р-на, і інш.). У апошні час шырока вывучаецца культавая і грамадзянская архітэктура эпохі Рэнесансу і барока. Археал.-архіт. даследаванні спалучаюцца з рамонтна-рэстаўрацыйнымі работамі.

*А.А.Трусаў.*

**«АРХЕАЛО́ГІЯ БЕЛАРУ́СІ»**, двухтомная галіновая энцыклапедыя. Першы том падрыхтаваны и выдадзены ў Мінску ў 2009 выд-вам «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» на бел. мове. Уключае звыш тыс. артыкулаў, пераважная большасць якіх прысвечана археал. культурам і помнікам. Ва ўводзінах разглядаецца гісторыя навукі з моманту яе ўзнікнення і сучасны стан. У аглядных артыкулах прыводзяцца характарыстыкі археал. культур, этнічных супольнасцей і гісторыка-культ. абласцей на тэр. Беларусі і блізкага замежжа. Тэматычныя артыкулы асвятляюць помнікі археалогіі, архітэктуры, архіт.-археал. комплексы, змяшчаюць інфармацыю аб археал. знаходках з апісаннем. Пэўнае месца

Энцыклапедыя **«Археалогія Беларусі»**.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ